най рабоце. Яна прадугледжвае сістэматызацыю экспазіцыйнай і культурна-адукацыйнай дзейнасці, аналіз накопленага вопыту і відавочных памылак. Такая аналітычная праца патрабуе адпаведнага прафесіяналізму. Першыя метадычныя распрацоўкі выкарыстоўваліся ў саміх музеях, але па меры назапашвання метадычны вопыт стаў распаўсюджвацца на іншыя профільныя музеі.

Такім чынам, прыведзены вышэй кароткі агляд навукова-даследчай дзейнасці музеяў Рэспублікі Беларусь адлюстроўвае шырыню дыяпазона гэтага кірунку дзейнасці музея. Асноўныя дасягненні ў гэтым кірунку звязаны з профільнай навукай. Увядзенне ў шырокі зварот вынікаў даследавання: ад выдання манаграфіі, каталогаў, зборнікаў да стварэння экспазіцый і выстаў – характэрна для кожнага музея. Праблемнымі для айчыннай музеязнаўчай навукі з'яўляюцца даследаванні ў галіне тэарэтычнага музеязнаўства.

## КУЛЬТУРНЫ ТУРЫЗМ ЯК СРОДАК ЗАХАВАННЯ І ВЫКАРЫСТАННЯ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ

***Д. В. Герасімёнак,***
*аспірант, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У апошнія гады сярод іншых відаў турызму (аздараўленчы, дзелавы, спартыўны і інш.) культурны турызм стаў займаць усё больш прыкметнае месца ў эканамічнай, сацыяльнай і ў асаблівасці духоўнай сферы сучаснага грамадства. Ён прадэманстраваў значныя тэмпы росту і маштабы ўплыву на ўзровень і накіраванасць развіцця сусветнай супольнасці. Паводле ацэнкі Сусветнай турысцкай арганізацыі (СТА) на культурны турызм у 2006 г. прыходзілася больш за 40 % усіх падарожжаў, што робіць яго адным з найбольш папулярных відаў турыстычнай дзейнасці [3, с. 185]. Узрастанне значэння культурнага турызму ў жыцці кожнай краіны на сучасным этапе сацыякультурнага развіцця абумоўлена працэсамі глабалізацыі і інтэрнацыяналізацыі, якія негатыўна адбіваюцца на захаванні лакальнай культуры соцыуму. Менавіта дадзены від турызму здольны вы-

клікаць цікавасць да традыцый і звычаяў народа, яго матэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны і ў пэўнай ступені садзейнічае іх захаванню.

Па вызначэнні СТА культурны турызм – гэта перамяшчэнне людзей з выключна культурнай матывацыяй у форме: навучальных тураў; тураў з мэтай агляду культурных славутасцяў; наведвання фестываляў і іншых культурных падзей; падарожжа з мэтай вывучэння фальклору, мастацтва, нацыянальных традыцый. Культурны турызм прадугледжвае наведванне гістарычных, культурных ці геаграфічных памятных мясцін. Асноўная мэта такіх падарожжаў – азнаямленне з гісторыка-культурнай спадчынай пэўнай краіны або рэгіёну (помнікамі гісторыі, архітэктуры, мастацтва; прыроднымі і этнічнымі асаблівасцямі; сучасным жыццём народа і т. п.). Азнаямленне мае розную матывацыю, напрыклад зацікаўленасць гісторыяй, культурай, прыродай, звычаямі і традыцыямі пэўнай мясцовасці або рэгіёну. Зыходзячы з гэтага вылучаюцца наступныя напрамкі культурнага турызму: экалагічны, рэлігійны, ваенна-гістарычны і інш. [4, с. 401]. Ключавой умовай развіцця культурнага турызму з’яўляецца гісторыка-культурны патэнцыял той ці іншай краіны, нацыянальная спадчына народа, наяўнасць разгалінаванай турысцкай інфраструктуры.

У Рэспубліцы Беларусь культурны турызм даволі даўно стаў самым папулярным і масавым відам турызму. З кожным годам расце колькасць людзей, якія жадаюць азнаёміцца з гістарычнымі і культурнымі славутасцямі краіны. Так, у 2015 г. гэтай магчымасцю скарысталіся 91,5 тыс. арганізаваных турыстаў і 745,2 тыс. экскурсантаў [6]. У дадзеным артыкуле мы ставім знак роўнасці паміж азначанымі групамі, зыходзячы з таго факта, што асноўнай мэтай культурнага турызму пры наведванні помнікаў гісторыі, культуры і прыроды з’яўляецца азнаямленне, а не час знаходжанння ў турыстычнай вандроўцы, і адной з асноўных форм азнаямлення турыста са спадчынай выступае экскурсія.

Шматлікія турысты жадаюць наведаць вядомыя гістарычныя і прыродныя помнікі, якімі багата беларуская зямля. У Дзяржаўны спіс гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь на 2015 год уключана 5527 аб’ектаў спадчыны, з іх матэрыяльных нерухомых – 5373, матэрыяльных рухомых – 78, не-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

матэрыяльных праяўленняў творчасці чалавека – 76. Матэрыяльныя аб’екты спадчыны прадстаўлены 2336 помнікамі археалогіі, 1759 помнікамі архітэктуры, 1192 помнікамі гісторыі, 60 помнікамі мастацтва, 11 помнікамі горадабудаўніцтва, 4 запаветнымі месцамі [2]. Пры ўмоўным разліку шчыльнасці помнікаў на квадратны кіламетр тэрыторыі і па колькасці насельніцтва атрымліваецца, што ў Беларусі адзін помнік прыпадае на 38 кв. км або на 1737 чалавек, што ў сярэднім параўнальна з нашымі краінамі-суседзямі [5].

Культурная спадчына краіны прызнана і за мяжой. У спіс Сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны ЮНЕСКА ўключаны: нацыянальны парк «Белавежская пушча» (як прыродны трансгранічны аб’ект, сумесна з Рэспублікай Польшча); замкавы комплекс «Мір» (г. п. Мір Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці); архітэктурна-культурны комплекс былой рэзідэнцыі Радзівілаў у Нясвіжы (Мінская вобласць); дуга Струве (трансгранічны аб’ект, 19 тапаграфічных кропак якога былі размешчаны на тэрыторыі Беларусі, 5 з іх дайшлі да нашага часу). Беларусь таксама прадстаўлена ў Рэпрэзентатыўным спісе сусветнай нематэрыяльнай культурнай спадчыны чалавецтва калядным абрадам «Цары», які адроджаны жыхарамі в. Семежава Капыльскага раёна Мінскай вобласці.

Музей займае вядучае месца ў арганізацыі культурнага турызму. Менавіта музейныя зборы і калекцыі, стварэнню якіх папярэднічае даследчая праца, могуць цэласна адлюстроўваць народную спадчыну пэўнай тэрыторыі, тым самым музейныя ўстановы, большая частка якіх размешчана ў гістарычных будынках, становяцца папулярнымі турыстычнымі аб’ектамі, галоўнымі транслятарамі нацыянальнай культуры. Найбольш наведваемымі турыстычнымі аб’ектамі ў нашай краіне на 2015 г. з’яўляюцца: Беларускі дзяржаўны музей Вялікай Айчыннай вайны (552 тыс. чалавек), мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой» (416,2 тыс. чалавек), Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік «Нясвіж» (407,9 тыс. чалавек) і інш. [7].

Для арганізацыі культурнага турызму важнейшае значэнне набывае ўсебаковая ацэнка таго ці іншага помніка гісторыі і культуры, якая можа быць заснавана на Дзяржаўным спісе гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Згодна



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Спісу матэрыяльныя помнікі падзяляюцца на катэгорыі ў залежнасці ад свайго значэння (0, 1, 2, 3). Прымаючы да ўвагі мэты і напрамкі культурнага турызму, па ўзроўнях запатрабаванасці гісторыка-культурную і прыродную спадчыну нашай краіны можна падзяліць на наступныя катэгорыі:

– спадчына сусветнага значэння (Сусветная спадчына ЮНЕСКА, помнікі міжнароднага значэння);

– спадчына рэспубліканскага значэння (значныя для супольнасці пэўнай краіны гістарычныя помнікі і музеі, запаведнікі і інш.);

– спадчына рэгіянальнага значэння, якая шырока вядома сярод мясцовага насельніцтва (грамадзянскія збудаванні, культавыя аб'екты і інш.).

Азначаны падыход можна прымяніць і да нематэрыяльнай культурнай спадчыны.

Відавочна, што ў мэтах захавання нацыянальнай культуры кожны ствараемы на аснове гісторыка-культурнай спадчыны турыстычны аб'ект павінен адлюстроўваць этнічныя асаблівасці і традыцыі, быць прываблівым для шырокіх мас насельніцтва.

Грунтуючыся на заканадаўчай базе ў галіне культуры, у тым ліку на праекце Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры, які актыўна абмяркоўваецца беларускім грамадствам, можна вылучыць асноўныя кірункі развіцця культурнага турызму, якія заснаваны на прынцыпах захавання і выкарыстання нацыянальнай і рэгіянальнай гісторыка-культурнай спадчыны і традыцый. Адны́мі з галоўных з'яўляюцца:

– прызнанне культурнай спадчыны этнічных супольнасцей, якія пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, у якасці аднаго з галоўных фактараў захавання самабытнасці нацыянальнай культуры краіны;

– захаванне і адраджэнне матэрыяльных і нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей з мэтаю забеспячэння інтарэсаў асобы і грамадства, а таксама пераемнасці культуры пакаленняў;

– агульнадаступнасць культурнай спадчыны краіны, забеспячэнне магчымасці далучэння да яе шырокіх колаў насельніцтва [1].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Выкарыстанне дадзеных прынцыпаў у арганізацыі культурнага турызму дазволіць забяспечыць пэўны эканамічны эфект і сфарміраваць у насельніцтва пачуццё павагі да вялікай і малой радзімы, стварыць падставы ганарыцца сваёй унікальнай спадчынай, даць магчымасці знаёміцца з ёй прадстаўнікам іншых культур, краін і рэгіёнаў. Паспяховае развіццё турызму, і, адпаведна, масавае прыцягненне патэнцыяльных турыстаў залежыць ад дзеянняў грамадства і дзяржавы, накіраваных на захаванне культурных, гістарычных і прыродных рэсурсаў мясцовасці. Для Рэспублікі Беларусь менавіта арыентацыя на культурны турызм як звязуючае звяно паміж насельніцтвам краіны і яго спадчынай стане адной з рэальных магчымасцяў эканамічнага, сацыяльнага і культурнага ўздыму.

*1.* Праект Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры [Электронны рэсурс] / Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. – Рэжым доступу : http://kultura.gov.by/temp/Of_the_Code_of_the_culture.doc. – Дата доступу : 13.03.2016.

*2.* Включение объектов в Список Всемирного наследия ЮНЕСКО популяризирует страну // Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://kultura.by/news/vklyuchenie-obektov-v-spisok-vsemirnogo-naslediya-yunesko-populyarizi-ruet-stranu. – Дата доступу : 22.03.2016.

*3.* Инвестирование в культурное разнообразие и диалог между культурами : всемир. докл. ЮНЕСКО / ООН по вопр. образования, науки и культуры. – Париж : ЮНЕСКО, 2010. – XV, 428 с.

*4. Рябова, Е. В.* Сущность понятия и направления культурного туризма / Е. В. Рябова // Культура. Наука. Творчество : сб. науч. ст. / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств [и др.]. – Минск, 2013. – Вып. 7. – С. 400–404.

*5.* Список историко-культурных ценностей Беларуси включает более 5,5 тыс. объектов // Новости Беларуси – БелТА [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://www.belta.by/culture/view/spisok-istoriko-kultur-nyh-tsennostej-belarusi-vkljuchaet-bolee-55-tys.-objektov-59805-2014. – Дата доступу : 15.03.2016

*6.* Туризм // Национальный статистический комитет Республики Беларусь [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://www.belstat.gov.by/ofitsialnaya-statistika/solialnaya-sfera/turizm/. – Дата доступу : 27.03.2016.

*7.* Что посмотреть и где побывать в Беларуси. Развлечения в Беларуси // Belarus.by [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.belarus.by/ru/travel/belarus-life. – Дата доступу : 19.03.2016.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ